# ПРАКТЫЧНЫЯ ЎРОКІ ІНТЭГРАЦЫІ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Эканамічны крызіс павінен з'яднаць удзельнікаў інтэграцыйных працэсаў, прымусіць іх развіваць кааперацыю, унутраныя вытворчыя ланцужкі, не канкурыраваць, а ўзаемадзейнічаць на знешніх рынках. «Вырашэнне гэтых задач у беларуска-расійскай «двойцы» дапаможа развіццю іншых фарматаў інтэграцыйнага аб'яднання», — адзначыў Прэзідэнт Беларусі.

Тэма ўмацавання супрацоўніцтва і пошуку яго новых вектараў падымалася і падчас выступлення Прэзідэнтаў на пленарным пасяджэнні форуму.

Аляксандр Лукашэнка, у прыватнасці, звярнуў увагу на збліжэнне прававой базы ў сацыяльна-гуманітарнай сферы. «Пры гэтым трэба ўлічваць высокую ступень эканамічнай інтэграцыі, агульны рынак працы і падобныя сацыяльна-дэмаграфічныя ўмовы», — лічыць Прэзідэнт. Кіраўнік беларускай дзяржавы адзначыў, што больш глыбокай гарманізацыі патрабуе заканадаўства ў галіне аховы здароўя: «Сістэмы яго арганізацыі могуць мець адрозненні, але неабходна ўрэгуляваць механізм роўнадаступных медыцынскіх паслуг, узаемных паставак лекавых сродкаў, іншыя пытанні».

Беларускі Прэзідэнт перакананы ў неабходнасці ствараць умовы для пашырэння супрацоўніцтва вучоных і канструктараў Саюзнай дзяржавы. «Свой важкі ўклад у яго арганізацыю могуць унесці расійскія рэгіёны, якія маюць буйныя навуковыя і прамысловыя цэнтры, моцныя вышэйшыя школы. Агульнымі намаганнямі мы можам і павінны забяспечыць прарыў у навукова-тэхнічнай галіне», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

Клопат пра ветэранаў — асабліва адказная вобласць інтэграцыйнага ўзаемадзеяння, падкрэсліў беларускі лідар, нагадаўшы, што праз два тыдні нашы краіны будуць адзначаць сумную дату 75-годдзя пачатку Вялікай Айчыннай вайны. Асаблівую ўвагу варта надаць і развіццю дзяржаўнай маладзёжнай палітыкі. «На рэгіянальным узроўні нам неабходна развіваць студэнцкі абмен, сістэму маладзёжнага турызму. Магутны імпульс актывізацыі такога супрацоўніцтва дае развіццё саюзнага студатрадаўскага руху», — перакананы Прэзідэнт Беларусі.

У эканамічным плане для Беларусі і Расіі важным застаецца фарміраванне адзінай прамысловай палітыкі. «Зняцце бар'ераў, фарміраванне адзінай прамысловай палітыкі і адзінага рынку — у нашых агульных інтарэсах, — падкрэсліў беларускі лідар. — Трэба не канкурыраваць адзін з адным, а, наадварот, аб'ядноўваць рэсурсы, каб супернічаць з замежнымі карпарацыямі ўнутры саюза, а затым пацясніць іх і на знешніх рынках. І, паверце, гэта ў нас атрымаецца».

Прэзідэнт Беларусі таксама лічыць, што сумеснымі намаганнямі нам неабходна выпрацаваць ідэалогію абароны і ўмацавання нашага інтэграцыйнага аб'яднання, якое па праву з'яўляецца самым прасунутым на постсавецкай прасторы, і не толькі на постсавецкай. Гэта яшчэ і таму, што ў нас ёсць вопыт жыцця ў адной дзяржаве, і, дзякуй Богу, расіяне і беларусы яго не зусім страцілі».

«Бясспрэчна, стварэнне Саюзнай дзяржавы Беларусі і Расіі дало магчымасць у значнай ступені актывізаваць тавараазварот, ажыццявіць цэлы шэраг буйнамаштабных сумесных праграм і праектаў. Прынесла ўзаемныя выгады і стала платформай для развіцця адносін па многіх іншых напрамках», — заўважыў Аляксандр Лукашэнка. «Аднак даводзіцца канстатаваць, што замест таго, каб аб'яднаць намаганні ва ўмовах крызісу, мы выжываем па адным. Навошта? Прэзідэнт Расіі ў аснову таксама паставіў менавіта гэтае пытанне. Давайце ў гэтых умовах будзем разам, — сказаў Прэзідэнт Беларусі. — З аднаго боку, атрымліваецца, што мы на самым высокім узроўні прымаем меры па стварэнні агульнага рынку, а з другога — дзяржавы (і мы такія, і Расія), рэагуючы на сусветныя выклікі, часта абараняюць толькі свае нацыянальныя інтарэсы. Беларусі і Расіі баяцца адна адну няма чаго — мы ўзаемадапаўняльныя па многіх пазіцыях, калі не па ўсіх, і трэба гэтым скарыстацца».

«Беларусь — наш важны эканамічны партнёр. На расійскі рынак пастаўляецца палова ўсёй беларускай экспартнай прадукцыі, — адзначыў падчас выступлення на форуме Уладзімір Пуцін. — Але можа быць яшчэ больш».

Расійскі лідар лічыць, што калі зрабіць некаторыя крокі па забеспячэнні інтарэсаў сваіх вытворцаў сельгаспрадукцыі, то беларускія калегі змогуць пастаўляць яшчэ больш прадукцыі на рынак Расіі. «Трэба скарыстацца сённяшняй сітуацыяй, каб пашырыць вытворчасць, у тым ліку пад патрэбы расійскага рынку», — сказаў Уладзімір Пуцін.

Расійскі Прэзідэнт канстатаваў, што, нягледзячы на скарачэнне ўзаемнага тавараабароту з-за нестабільнасці сыравінных цэн і валютных ваганняў у 2015 годзе, сумеснымі намаганнямі ў 2016 годзе ўзаемны гандаль удалося вярнуць у ранейшае рэчышча. У першым квартале гэтага года фізічныя аб'ёмы паставак ўзраслі на 2,6%. Расійскі экспарт у Беларусь дадаў 1,6%, а беларускі — 4,4%. Пашыраюцца і сустрэчныя патокі капіталаў. У студзені — сакавіку 2016 года аб'ём расійскіх інвестыцый у Беларусь перавысіў $ 1,5 млрд. У рэспубліцы ёсць 961 прадпрыемства са стапрацэнтным расійскім капіталам.

Прэзідэнт Расіі таксама адзначыў, што сустрэчы прадстаўнікоў рэгіянальнага кіраўніцтва, дзелавых колаў дзвюх краін становяцца ўсё больш важкім фактарам у адносінах Беларусі і Расіі.

Учора Аляксандр Лукашэнка і Уладзімір Пуцін наведалі 26-ю міжнародную спецыялізаваную выставу «Белагра-2016».

**Паводле БЕЛТА.**

■ Сябруем рэгіёнамі

# ДЗЕЛАВЫ ПАДЫХОД

## Прадстаўнікі беларускіх і расійскіх рэгіёнаў бачаць новыя напрамкі для супрацоўніцтва

**Якімі дасягненнямі можна пахваліцца, а над чым яшчэ трэба папрацаваць? Якія напрамкі супрацоўніцтва з нашай краінай цікавяць расійскіх чыноўнікаў у першую чаргу? Другі дзень Форуму рэгіёнаў Беларусі і Расіі даў адказ на гэтыя пытанні.**

Дзень пачаўся сустрэчай **старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Міхаіла МЯСНІКОВІЧА, прэм'ер-міністра нашай краіны Андрэя КАБЯКОВА, старшыні Савета Федэрацыі Федэральнага сходу Расіі Валянціны МАТВІЕНКІ** з губернатарамі беларускіх і расійскіх рэгіёнаў.

**Сямён ШАПІРА, старшыня Мінаблвыканкама,** паведаміў журналістам пасля перамоў, што ў першую чаргу абмяркоўваўся ўзаемны гандаль. Сярод іншага на сустрэчы было адзначана, што краінам варта больш актыўна развіваць узаемны экспарт будаўнічых паслуг.

— Сёння неабходна, каб прадпрыемствы Беларусі і Расіі былі загружаныя, адпаведна, каб людзі атрымлівалі дастойную заработную плату, — адзначыў старшыня Мінаблвыканкама. — Будаўніцтва аб'ектаў у Расіі будзе весціся сіламі беларускіх будаўнікоў, а на нашу тэрыторыю будуць прыцягвацца работнікі з розных расійскіх рэгіёнаў. У Беларусі будуць з'яўляцца расійскія будаўнічыя кварталы, у Расіі — нашы.

**Святлана АРЛОВА, губернатар Уладзімірскай вобласці Расіі,** паведаміла, што яе рэгіён вельмі шчыльна супрацоўнічае з нашымі абласцямі і сказала, што бачыць перспектывы па супрацоўніцтве з нашай краінай у торфавай прамысловасці.

— Я лічу, што ў нас можа быць сур'ёзнае ўзаемадзеянне. Мы зараз пачынаем супрацоўнічаць з Гомельскай вобласцю, — паведаміла кіраўнік Уладзімірскай вобласці. Трэба сказаць, што ўчора паміж гэтымі рэгіёнамі было падпісана пагадненне аб супрацоўніцтве.

**Павел КАНЬКОЎ, губернатар Іванаўскай вобласці,** прызнаўся, што яго рэгіёну вельмі падабаецца супрацоўнічаць з Беларуссю:

— Мы на сочынскім форуме (другі Форум рэгіёнаў. — **Аўт.**) падпісалі пагадненні з Беллегпрамам, з рэгіёнамі, а вясной гэтага года я прыязджаў з дэлегацыяй у Беларусь. Вялікі дзякуй вашаму Прэзідэнту, які знайшоў час нас прыняць, сур'ёзная размова адбылася ва ўрадзе. У нас ёсць напрамкі для супрацоўніцтва.

**Сяргей ГРАЧОЎ, старшыня заканадаўчага сходу Арэнбургскай вобласці,** расказаў пра супрацоўніцтва з Гомельшчынай:

— З Гомельскай вобласці да нас ідуць буйныя пастаўкі сельскагаспадарчай тэхнікі. У нас створаны вялікі лагістычны цэнтр для беларускай тэхнікі. Галоўнае пытанне цяпер заключаецца ў тым, як зрабіць сэрвісны цэнтр. Трэба сказаць, што беларускія прадпрыемствы з задавальненнем над гэтым працуюць. Усе ад гэтага атрымліваюць толькі карысць.

**Сцяпан ЖЫРАКОЎ, прадстаўнік Забайкальскага края ў Савеце Федэрацыі Федэральнага сходу Расіі,** таксама сказаў добрае слова пра беларускую тэхніку:

— «БелАЗы» — цудоўныя машыны! У нас працуюць такія з грузапад'емнасцю 27,45 тоны. Мы заўсёды лічылі, што мінчане дапамагаюць здабываць нам нашы карысныя выкапні. Ды і не толькі мінчане. Той жа бабруйскі завод нам пастаўляе шыны. Але ў Беларусі ў нас ёсць і іншыя інтарэсы. Наш край можна назваць аграрным, таму з вялікай цікавасцю я з'ездзіў і пагледзеў, як тут арганізавана ў вас парніковая гаспадарка. Натуральна, у Забайкаллі буду расказваць пра гэта сваім калегам.

**Віктар ЗІМІН, старшыня ўрада Рэспублікі Хакасія,** расказаў, што ў яго рэспубліцы трымаецца традыцыйна высокі попыт на беларускую тэхніку — тых жа трактароў маркі «Беларус» налічваецца каля 90 тысяч. Увогуле ж, на яго думку, у рэгіёнаў Беларусі і Расіі ёсць яшчэ шмат кірункаў для развіцця супрацоўніцтва.

* * *

— Форум рэгіёнаў — зручная дадатковая пляцоўка для разгляду ідэй і праектаў, прыняццяў неабходных рашэнняў, — заявіў падчас пленарнага пасяджэння Міхаіл Мясніковіч. — Важна тое, што ў нашай працы няма бюракратычнай заарганізаванасці. Тое, што форумы носяць рэгулярны характар, сведчыць пра сістэмную працу. Удзел у форумах прэзідэнтаў нашых краін надае асаблівую статуснасць і адказнасць нашай працы.

**Рыгор РАПОТА, Дзяржаўны сакратар Саюзнай дзяржавы,** звярнуў увагу на тое, што трэці Форум рэгіёнаў прысвечаны пытанням узаемадзеяння ў сацыяльнай сферы — гэта культура, адукацыя, сацыяльная абарона, працоўныя адносіны, ахова здароўя, інфармацыйная прастора.

— Відавочна, што супрацоўніцтва ў гэтых галінах залежыць ад дынамікі развіцця двухбаковых гандлёва-эканамічных сувязяў, што таксама з'яўляецца прадметам абмеркавання на нашым форуме, і, відаць, на любым іншым мы наўрад ці пазбегнем абмеркавання гэтай тэмы, — прызнаў ён. — Можна з упэўненасцю сказаць, што за 20 гадоў існавання нашай Саюзнай дзяржавы было зроблена шмат.

**Наталля КАЧАНАВА, намеснік прэм'ер-міністра нашай краіны,** зазначыла, што ў цяперашніх эканамічных умовах асаблівую важнасць набываюць пытанні захавання стабільнай сітуацыі і развіцця агульнага рынку працы.

Многае ў гэтым кірунку ўжо зроблена. Праведзена значная праца па ўніфікацыі заканадаўства нашых краін, забяспечаны адкрыты доступ да створаных банкаў вакансій, рэалізаваны шэраг іншых захадаў па павышэнні тэрытарыяльнай мабільнасці працоўнай сілы ў рамках Саюзнай дзяржавы.

* * *

Усе ўдзельнікі форуму, з якімі давялося пагутарыць, адзначалі высокі ўзровень яго арганізацыі, а таксама яго практычную вартасць. Няхай гэта мерапрыемства праводзіцца ўсяго толькі трэці раз, у яго карыснасці сумненняў не ўзнікае. Як паведаміла ў канцы пленарнага пасяджэння Валянціна Матвіенка, наступны Форум рэгіёнаў пройдзе ў Расіі. Яго тэма, хутчэй за ўсё, будзе прысвечана высокім тэхналогіям і інавацыям.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.**

■ Выбары

# КАНДЫДАТ, РЫХТУЙ СВОЙ ФОНД

## У колькі абыдзецца выбарчая кампанія?

**На ўчарашнім пасяджэнні Цэнтральнай камісіі па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў быў агучаны бюджэт кампаніі парламенцкіх выбараў. Для Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу ён склаў больш за 196 мільярдаў беларускіх рублёў, для Савета Рэспублікі — больш за 164 мільёны рублёў. Агульны бюджэт выбараў — 196 мільярдаў 725 мільёнаў рублёў.**

Плануецца, што першы транш фінансавання адбудзецца 15 чэрвеня і складзе 500 мільёнаў рублёў, апошні — да 1 верасня гэтага года. У дзень выбараў кожны член участковай выбарчай камісіі атрымае зарплату (без уліку падатку ў 13%) у 700 тысяч рублёў.

Выдаткі на выбары ў Палату прадстаўнікоў шостага склікання пойдуць на функцыянаванне 6000 участковых выбарчых камісій, 110 акруговых выбарчых камісій, 7 тэрытарыяльных, на расходы Міністэрства замежных спраў па фінансаванні 49 участковых камісій, якія будуць створаныя за межамі краіны, а таксама на расходы Цэнтральнай камісіі. Што тычыцца выбараў у Савет Рэспублікі, то выдзеленыя сродкі пойдуць на пакрыццё выдаткаў абласных і Мінскага гарадскога выканаўчых камітэтаў, а таксама Цэнтральнай камісіі.

Па словах **Лідзіі ЯРМОШЫНАЙ, старшыні Цэнтрвыбаркама,** кандыдатам варта задумацца аб фінансаванні кампаніі. «Цяпер не давядзецца ўдзельнічаць у выбарах так, як кандыдаты ўдзельнічалі раней, разлічваючы на дзяржаву і не ўкладваючы ўласных сродкаў, не ствараючы выбарчых фондаў. На выбарах 2012 года толькі адна чвэрць кандыдатаў у дэпутаты паспрабавалі адкрыць выбарчыя фонды і яшчэ менш іх напоўнілі», — паведаміла яна. На думку кіраўніка ЦВК, гэта сведчыць пра тое, што фінансаванне ўласнай перадвыбарнай агітацыйнай кампаніі ў Беларусі раней амаль не ажыццяўлялася. Таму цяпер кандыдаты павінны будуць укладваць у правядзенне дадатковай агітацыі ўласныя грошы або задаволіцца тым, што дзяржава прадастаўляе бясплатна, — радыё- і тэлевізійны час, газетныя плошчы для апублікавання праграмы, а таксама памяшканне для сустрэч з выбаршчыкамі.

Адпаведныя выбарчыя фонды будуць фарміравацца за кошт уласных грашовых сродкаў кандыдата, а таксама добраахвотных ахвяраванняў грамадзян Рэспублікі Беларусь — не больш за 5 базавых велічынь ад адной асобы — і юрыдычных асоб — не больш за 10 базавых велічынь адпаведна. Крайняя сума выдаткаў са сродкаў выбарчага фонду — 1000 базавых велічынь, ці 210 мільёнаў рублёў.

Акрамя таго, на пасяджэнні Цэнтрвыбаркама быў зацверджаны каляндарны план правядзення выбараў у Палату прадстаўнікоў. Так, з 3 ліпеня па 1 жніўня будзе ажыццяўляцца вылучэнне кандыдатаў у дэпутаты. Пры гэтым рэгістрацыя і падача адпаведных дакументаў павінны быць ажыццёўлены не пазней за 7 ліпеня. Да 1 жніўня ўключна мусяць быць пададзены заявы і ўсе дакументы, неабходныя для рэгістрацыі кандыдатаў у дэпутаты. Сама рэгістрацыя кандыдатаў будзе праходзіць 10 дзён — з 2 па 11 жніўня. Не пазней за 24 чэрвеня ўключна павінна прайсці вылучэнне прадстаўнікоў у склад выбарчых камісій — абласных, мінскую гарадскую і акруговых. Участкі для галасавання ўтвараюцца не пазней за 9 ліпеня. 27 ліпеня — апошні тэрмін вылучэння ва ўчастковыя камісіі. Спісы грамадзян, якія маюць права ўдзельнічаць у выбарах, павінны быць складзены да 26 жніўня. Не пазней за 26 чэрвеня мусяць быць вызначаны месцы, забароненыя да ўстаноўкі пікетаў па зборы подпісаў у падтрымку патэнцыяльных кандыдатаў. Вынікі выбараў дэпутатаў у Палату прадстаўнікоў неабходна падвесці не пазней за 15 верасня акруговым выбаркамамі.

**Вераніка ПУСТАВІТ.** *pustavit@zviazda.by*

**«Управляющий ООО «Партнер-Консультант»**

**проводит торги в форме открытого аукциона по продаже имущества ОАО «Управляющая компания холдинга «Забудова», неиспользуемого в хозяйственной деятельности должника, а именно:**

| № Лота | Наименование | Кол-во, шт. | Начальная цена с НДС, бел. руб | Задаток с НДС, бел руб. | Шаг аукциона, % |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Газовая плита | 1 | 76 182 182 | 761 822 | 5 |
| | Бензопила MS-230 | 1 | | | |
| | Чехол для квадроцикла | 1 | | | |
| | Казан чугунный 10л. | 1 | | | |
| | Казан чугунный 12л. | 1 | | | |
| | Холодильник МХ 2823-80 «Атлант» | 1 | | | |
| | Секция «Тройка 4Д1» | 1 | | | |
| | Мотоблок «Беларус» 09Н | 1 | | | |
| | Буфет Викинг GL-05/01 | 1 | | | |
| | Казан чугунный 20л. | 2 | | | |
| | Кронштейн для LCD 37 | 1 | | | |
| | Лебедка (1135 кг.) с комплектом крепления | 1 | | | |
| | Стул Викинг-05 | 6 | | | |
| | Казан чугунный бл. | 1 | | | |
| | Радиатор масляный 7сек. | 2 | | | |
| | Телевизор «Горизонт» | 1 | | | |
| | Крышка к казану 20л. | 2 | | | |
| | Квадроцикл «ATV OVTLANDERMAX» | 1 | | | |
| | Стол обеден. Викинг GL-05 | 1 | | | |
| | Крышка к казану ч/ч 12л. | 1 | | | |
| | Печь СВЧ ДЭУ KOR-412A | 1 | | | |
| | Варочная поверхность | 1 | | | |
| | Прицеп мотоблочный ПМ | 1 | | | |
| | Ионизатор воздуха | 1 | | | |
| 2 | Бильярдный стол (комплект) | 1 | 40 000 000 | 400 000 | 5 |
| 3 | Бильярдный стол (комплект) | 1 | 40 000 000 | 400 000 | 5 |
| 4 | Бильярд «Корнет» (комплект) | 1 | 10 000 000 | 100 000 | 5 |
| 5 | Поддон трансп. ЗСК П2-1, 640*1000 | 1 112 | 137 875 546 | 1 378 755 | 5 |
| 6 | Поддон технологический, тяж. бет. | 148 | 78 006 271 | 780 063 | 5 |

**Аукцион состоится 11.07.2016 г. в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д.1, офис 1122. Заявки на участие в аукционе принимаются с 13.06.2016 по 08.07.2016 г.**

**Для участия в торгах лицо, заявившее о своем участии в торгах, вносит задаток в счет обеспечения оплаты приобретаемого на торгах имущества в размере 1 процента от начальной цены имущества должника, выставляемого на торги. Задаток перечисляется на следующие реквизиты: р/с № 3012203270019 ОАО «АСБ Беларусбанк», код 769, УНП 600042619.**

**По вопросу участия в аукционе, ознакомления с предметами торгов, а также по всем иным интересующим вопросам, связанным с проведением торгов, обращаться по тел. +375 (17) 395-81-34; +375 (29) 698- 51-76**